**І. Н. КОЛАБАВА**
***(Мінск, Беларусь)***

# АРХІЎНЫЯ ДАКУМЕНТЫ XIX ст. АБ ПЕРАПЛАЎЦЫ РАСІЙСКАЙ МЕДНАЙ МАНЕТЫ

Фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск) утрымліваюць матэрыялы аб правядзенні следчых мерапрыемстваў, звязаных з праблемай незаконнай пераплаўкі расійскай меднай манеты.

У канцы XVIII – пачатку XX ст. рэальная вартасць расійскіх медных манет значна перавысіла іх намінальны паказнік, што, зразумела, прыводзіла да выціскання меднай манеты з абарачэння шляхам пераўтварэння яе ў каштоўны металічны лом.

— 8.04.1815 г. у рапарце гарадской паліцыі віцебскаму цывільнаму губернатару адзначаецца, што ў месціча Шалыты знойдзены «один мешок медных денег прошлых лет», сабраных, магчыма, для злоўжыванняў (НГАБ, Ф. 1430, Воп. 1, Спр. 206).

— 12.06.1815 г. у хаце селяніна памешчыка Быкоўскага былі выяўлены 25 мяшкоў медных манет, што складала «более 1000 рублей, все пятаками и грошами покойного государя императора Павла I» (НГАБ, Ф. 1430, Воп.1, Спр. 177).

— 15.03.1828 г. віцебскі цывільны губернатар паведамляе аб затрыманні ў горадзе падводы з меднымі зліткамі, якая накіроўвалася ў маёнтак генерал-маёра Гурко, дзе, магчыма, адбывалася злоўжыванне «чрез переплавление медной монеты» (НГАБ, Ф. 1297, Воп. 1, Т. 2, Спр. 3080; НГАБ, Ф. 1430, Воп. 1, Спр. 1294).

Прыведзеныя факты сведчаць аб тым, што мясцовыя ўлады пільна адсочвалі сітуацыі, звязаныя з магчыма крымінальным выкарыстаннем меднай манеты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ